# У сістэме канстытуцыяналізму

## Доступ грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя

**Канстытуцыяналізм – неад'емны элемент сучаснай дэмакратычнай дзяржавы. Асновай зацвярджэння канстытуцыяналізму ў Беларусі з'яўляюцца нормы і прынцыпы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прынятай 15 сакавіка 1994 года. Асноўны закон абвяшчае Беларусь дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай, у якой чалавек, яго свабоды і гарантыі іх рэалізацыі ёсць найвышэйшая каштоўнасць і мэта.**



**Наталля КАРПОВІЧ, намеснік старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, доктар юрыдычных навук**

Як адзначаў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у шэрагу сваіх штогадовых пасланняў Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь, важнейшымі складнікамі канстытуцыяналізму выступаюць вяршэнства права, няўхільнае выкананне канстытуцыйных прадпісанняў усімі дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі, службовымі асобамі і грамадзянамі, устанаўленне балансу інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы на аснове канстытуцыйных каштоўнасцей, а таксама канстытуцыйная законнасць, якая прадвызначае непахіснасць устояў народаўладдзя і канстытуцыйнага ладу (рашэнні Канстытуцыйнага Суда ад 21 студзеня 2014 года, ад 20 студзеня 2016 года і ад 18 студзеня 2017 года).

Згодна з Канстытуцыяй у Рэспубліцы Беларусь устанаўліваецца прынцып вяршэнства права; дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства (арт. 7). Гэтыя палажэнні, што вызначаюць асновы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, знаходзяць развіццё ў іншых нормах Асноўнага закона, якія замацоўваюць канстытуцыйна-прававы статус асобы, а таксама парадак яе ўзаемадзеяння з грамадствам і дзяржавай.

Канстытуцыйна-прававы статус асобы вызначаецца канстытуцыйнымі прынцыпамі і нормамі аб адказнасці грамадзяніна перад дзяржавай за няўхільнае выкананне абавязкаў, ускладзеных на яго Канстытуцыяй, аб праве кожнага на годны ўзровень жыцця, аб роўнасці ўсіх перад законам (арт. 2, 21 і 22 Канстытуцыі), аб іншых правах і свабодах асобы ў палітычнай, эканамічнай, экалагічнай і іншых сферах.

Канстытуцыя замацоўвае палажэнні аб правах грамадзян удзельнічаць у вырашэнні дзяржаўных спраў як непасрэдна, так і праз свабодна выбраных

### ПРА АЎТАРА

КАРПОВІЧ Наталля Аляксандраўна.
Нарадзілася ў в. Дакудава Лідскага раёна Гродзенскай вобласці.
Скончыла юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1989), аспірантуру Інстытута філасофіі і права Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1992).
З 1992 года – старшы рэферэнт аддзела па пытаннях заканадаўства і правапарадку, загадчык сектара экспертна-прававога ўпраўлення Сакратарыята Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, з 1997 – загадчык аддзела экспертна-прававога ўпраўлення, намеснік начальніка Галоўнага экспертна-прававога ўпраўлення Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, з 2001 года – начальнік Галоўнага экспертна-прававога ўпраўлення Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.
З сакавіка 2014 года – суддзя, з сакавіка 2017 года – намеснік старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.
Доктар юрыдычных навук (2012), дацэнт (2010).
Аўтар больш як 100 навуковых работ, у тым ліку трох манаграфій.
Сфера навуковых інтарэсаў: агульная тэорыя дзяржавы і права, канстытуцыйнае, грамадзянскае і міжнароднае права, экалагічнае права.



◀ Абвяшчэнне заключнай часткі Паслання Канстытуцыйнага Суда Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2016 годзе»

прадстаўнікоў, накіроўваць асабістыя або калектыўныя звароты ў дзяржаўныя органы, аб гарантаванні кожнаму абароны яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом у вызначаныя законам тэрміны (арт. 37, 40 і 60).

Такім чынам, Канстытуцыя надзяляе грамадзян правамі, свабодамі і абавязкамі, неабходнымі і дастатковымі для выяўлення і рэалізацыі здольнасцей кожнага, забеспячэння і абароны яго інтарэсаў у розных сферах жыццядзейнасці без парушэння правоў, свабод і законных інтарэсаў іншых асоб, устанаўлення балансу інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы на аснове канстытуцыйных каштоўнасцей як аднаго з найважнейшых праяўленняў канстытуцыяналізму.

Канстытуцыяналізм ахоплівае сваім зместам дакладнае і няўхільнае выкананне ўсімі суб'ектамі грамадскіх адносін нормаў аб правах, свабодах і абавязках грамадзян, што замацоўваюцца іерархічна арганізаванай сістэмай нарматыўных прававых актаў, у якой Канстытуцыя мае вышэйшую юрыдычную сілу. З'яўляючыся актам прамога дзеяння, Канстытуцыя ўстанаўлівае, што забеспячэнне правоў і свабод грамадзян – найвышэйшая мэта дзяржавы; дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаныя міжнароднымі абавязацельствамі дзяржавы (ч. 1-я і 3-я арт. 21).

У гэтым кантэксце бачным увасабленнем канстытуцыяналізму з'яўляецца канстытуцыйная законнасць. Да ліку канстытуцыйных гарантый захавання і абароны правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян, накіраваных на зацвярджэнне канстытуцыйнай законнасці, адносіцца абавязак дзяржавы прымаць усе даступныя ёй меры дзеля стварэння ўнутранага і міжнароднага парадку, неабходнага для поўнага ажыццяўлення правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь, прадугледжаных Канстытуцыяй. Пры гэтым дзяржаўныя органы, службовыя і іншыя асобы, якім даверана выкананне дзяржаўных функцый, абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі прымаць неабходныя меры для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод асобы (ч. 1-я і 2-я арт. 59).

Прыведзеныя канстытуцыйныя прынцыпы і нормы – базавыя для прававой

рэгламентацыі парадку рэалізацыі правоў і свабод грамадзян падканстытуцыйнымі нарматыўнымі прававымі актамі, а таксама для фарміравання належнай правапрымяняльнай практыкі органаў дзяржавы і службовых асоб.

Канстытуцыя як аснова канстытуцыяналізму адлюстроўвае сістэму базавых палітыка-прававых каштоўнасцей, канцэпцыю і філасофію арганізацыі дзяржаўна-грамадскага ладу Беларусі, якія нязменныя ў сваёй сутнасці з моманту іх канстытуцыйна-прававога замацавання, але пастаянна развіваюцца ў розных аспектах зместу, як і канстытуцыйна-прававыя адносіны і канстытуцыйная правасвядомасць. Пры гэтым значэнне Канстытуцыі як крытэрыю справядлівасці і ідэала права ўсё больш зацвярджаецца ў грамадскай свядомасці і практыцы. Выкананне яе палажэнняў – важны фактар стабільнасці і ўстойлівасці палітычнай, сацыяльнай і эканамічнай сістэм Беларусі.

Дадзеныя ўласцівасці Канстытуцыі прадугледжваюць стварэнне палітыка-прававых інстытутаў і механізмаў забеспячэння яе выканання, да важнейшых з якіх адносіцца канстытуцыйны кантроль. З'яўляючыся сусветна прызнаным інстытутам у практыцы канстытуцыяналізму, канстытуцыйны кантроль павінен забяспечваць вяршэнства і прамое дзеянне Канстытуцыі, фарміраванне адзінай канстытуцыйна-прававой прасторы краіны, у якой прыярытэтна абараняюцца правы і свабоды індывіда, а таксама публічныя інтарэсы (гэта значыць інтарэсы грамадства, нацыі, дзяржавы) у абароне канстытуцыйнага ладу, забеспячэнні дзяржаўнасці і яе ўстойлівага развіцця, зацвярджэнне канстытуцыйнай законнасці ў нарматворчасці і правапрымяненні.

Канстытуцыйны кантроль у Рэспубліцы Беларусь базіруецца на палажэннях артыкула 116 Канстытуцыі і іншых яе прынцыпах і нормах. Прававое рэгуляванне канстытуцыйнага кантролю ўключае нормы Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, Закона Рэспублікі Беларусь «Аб канстытуцыйным судаводстве», іншых актаў заканадаўства, якія замацоўваюць кампетэнцыю, арганізацыю, парадак дзейнасці Канстытуцыйнага Суда і ажыццяўлення канстытуцыйнага судаводства. Названымі актамі заканадаўства вызначаецца механізм доступу грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя, рэалізацыі імі іншых правамоцтваў ва ўзаемаадносінах з Канстытуцыйным Судом, якія вынікаюць з палажэнняў Канстытуцыі.

Неабходна адзначыць, што прамая канстытуцыйная скарга грамадзян як форма рэалізацыі індывідуальнага доступу да канстытуцыйнага правасуддзя ў Канстытуцыі не прадугледжана. У айчыннай прававой сістэме функцыянуе ўскосны доступ грамадзян і арганізацый да канстытуцыйнага правасуддзя, гэта значыць права названых суб'ектаў звярнуцца ў Канстытуцыйны Суд апасродкавана. Гэты від доступу грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя прызнаны Еўрапейскай камісіяй за дэмакратыю праз права (Венецыянскай камісіяй) важным інструментам забеспячэння індывідуальных правоў чалавека на канстытуцыйным узроўні.

У Даследаванні № 538/2009 па пытанні доступу грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя, прынятым Венецыянскай камісіяй 17–18 снежня 2010 года, адзначана, што ў міжнароднай практыцы асноўным відам індывідуальнага ўскоснага доступу з'яўляецца кантроль, ініцыяваны амбудсменам або звычайнымі судамі. Пры гэтым адным з самых развітых відаў індывідуальнага доступу названы разгляд спраў па папярэдніх запытах судоў. Як асобны від ускоснага доступу Венецыянскай камісіяй разглядаецца доступ пры дапамозе іншых органаў. Такімі органамі выступаюць у Арменіі, Азербайджане, Балгарыі пракуратура, у Рэспубліцы Беларусь – упаўнаважаныя дзяржаўныя органы.

Права грамадзян звяртацца ў Канстытуцыйны Суд па пытаннях праверкі канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў праз упаўнаважаных суб'ектаў вынікае з палажэнняў артыкула 22

Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў. З ініцыятывай аб унясенні прапаноў аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта, прымененага ў канкрэтным рашэнні дзяржаўнага органа або пастанове суда агульнай юрысдыкцыі, у выніку чаго, на думку грамадзяніна, парушаюцца яго правы, свабоды і законныя інтарэсы, гэты грамадзянін звяртаецца да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у іншыя органы, надзеленыя артыкулам 116 Канстытуцыі правам унясення ў Канстытуцыйны Суд такіх прапаноў, – палат Нацыянальнага сходу, Вярхоўнага Суда, Савета Міністраў.

Ва ўмовах адсутнасці прамога доступу грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя ў Рэспубліцы Беларусь прававая рэгламентацыя такіх ініцыятыўных зваротаў накіравана на забеспячэнне кожнаму канстытуцыйнай гарантыі судовай абароны яго правоў і свабод, у тым ліку пры дапамозе ажыццяўлення канстытуцыйнага правасуддзя як неад’емнай умовы забеспячэння канстытуцыйнай законнасці.

Аналіз практыкі ініцыятыўных зваротаў грамадзян да ўпаўнаважаных органаў паказвае: у большасці выпадкаў у выніку разгляду такіх зваротаў гэтыя органы робяць вывад аб адсутнасці дастатковых падстаў меркаваць, што нарматыўны прававы акт, канстытуцыйнасць якога заяўнік прапаноўвае праверыць, супярэчыць Канстытуцыі, а значыць, адсутнічаюць падставы для рэалізацыі іх правамоцтваў унесці прапанову ў Канстытуцыйны Суд аб дачы заключэння на прадмет канстытуцыйнасці гэтага нарматыўнага прававога акта. З аднаго боку, нізкая актыўнасць па ўнясенні ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі прапаноў аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў сведчыць аб дасягнутым пэўным канстытуцыйна якасным узроўні нацыянальнага заканадаўства, належным узаемадзеянні органаў усіх галін улады ў заканатворчым працэсе ў мэтах дасягнення балансу публічных і прыватных інтарэсаў, стабільнасці ў грамадстве і дзяржаве, на што ўказаў Канстытуцыйны Суд у Пасланні «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2015 годзе».

Разам з тым асаблівае значэнне маюць правамернасць і дастатковасць аргументацыі для адмовы ўпаўнаважаных органаў грамадзяніну ва ўнясенні прапановы ў Канстытуцыйны Суд. Такая адмова не павінна базіравацца на меркаванні асобнай службовай асобы гэтага органа аб несупярэчнасці нарматыўнага прававога акта Канстытуцыі, паколькі вывад аб гэтым мае паўнамоцтва рабіць толькі Канстытуцыйны Суд, даючы адпаведнае заключэнне. Так, у адпаведнасці з унесенымі Законам Рэспублікі Беларусь ад 22 снежня 2016 года змяненнямі рэгулявання артыкулам 28 Закона «Аб канстытуцыйным судаводстве» доступу да канстытуцыйнага правасуддзя дзяржаўны орган, які разглядае ініцыятыўны зварот, не мае права рабіць вывад аб канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта; падставай для ўнясення прапановы ў Канстытуцыйны Суд з’яўляецца наяўнасць сумненняў упаўнаважанага органа ў канстытуцыйнасці такога акта.

Трэба адзначыць, што звароты грамадзян з прапановамі аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў паступаюць і непасрэдна ў Канстытуцыйны Суд. Пры гэтым грамадзяне кіруюцца нормамі артыкулаў 40 і 60 Канстытуцыі, якія ўстанаўліваюць, што кожны мае права накіроўваць асабістыя або калектыўныя звароты ў дзяржаўныя органы; кожнаму гарантуецца абарона яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом у вызначаныя законам тэрміны. Аднак з-за адсутнасці ў грамадзян права ініцыяваць такую праверку ў Канстытуцыйным Судзе названыя звароты разглядаюцца не ў парадку канстытуцыйнага судаводства, а ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб.

У ходзе вывучэння зваротаў грамадзян аналізуецца наяўнасць або адсутнасць падстаў для рэагавання Канстытуцыйнага Суда ў межах яго кампетэнцыі;





▲ У час сімпозіума «Развіццё форм канстытуцыйнага кантролю ў сучасных умовах» з удзелам дэлегацыі Канстытуцыйнага Суда Расійскай Федэрацыі. Мінск, 2016 год

выяўляюцца недахопы заканадаўства, іх канстытуцыйна-прававая значнасць; устанаўліваецца, ці парушаны канстытуцыйныя правы і свабоды суб'ектаў зваротаў, іншыя істотныя акалічнасці. У мэтах забеспячэння рэалізацыі канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян Канстытуцыйным Судом могуць уносіцца прапановы адпаведным дзяржаўным органам аб неабходнасці ўстаранення недахопаў заканадаўства, выяўленых у ходзе вывучэння пастаўленых у зваротах пытанняў. Так, у 2016 годзе ўнесена пяць прапаноў Канстытуцыйнага Суда ўпаўнаважаным суб'ектам нарматворчай дзейнасці аб неабходнасці ўнясення змяненняў і дапаўненняў у нарматыўныя прававыя акты Рэспублікі Беларусь. Дзве з такіх прапаноў у тым жа годзе атрымалі ўвасабленне ў актах заканадаўства.

У прыватнасці, зыходзячы з нормаў Канстытуцыі, што гарантуюць бясплатнасць агульнай сярэдняй адукацыі, Канстытуцыйным Судом унесена прапанова Савету Міністраў прыняць меры па замацаванні дыферэнцаванага парадку пакрыцця сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку рабочага, служачага ў дзяржаўнай прафесійна-тэхнічнай установе з адначасовым атрыманнем ім агульнай сярэдняй адукацыі, за выключэннем сродкаў, затрачаных дзяржавай на атрыманне навучэнцам агульнай сярэдняй адукацыі. Прапанова ўлічана ў пастанове Савета Міністраў ад 7 снежня 2016 года № 998 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 чэрвеня 2011 года № 821».

Ва ўрад таксама ўнесена прапанова Канстытуцыйнага Суда, у якой указана, што ў заканадаўстве, зыходзячы з фінансавых магчымасцей дзяржавы, могуць быць вызначаны асаблівасці прававога рэгулявання пенсійнага забеспячэння некаторых катэгорый асоб, чыё становішча пагоршылася ў сувязі з замацаваннем патрабавання аб наяўнасці пастаянна растучага (да 20 гадоў) страхавога стажу, якія ў большай ступені гарантуюць ім узровень пенсійнага забеспячэння, суразмерны іх працоўнаму ўкладу або значнасці для дзяржавы выконваемых імі функцый. Пазіцыя Канстытуцыйнага Суда знайшла адлюстраванне ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 жніўня 2016 года № 308 «Аб пенсійным забеспячэнні асобных катэгорый ваеннаслужачых».

Іншыя прапановы Канстытуцыйнага Суда, накіраваныя ў мінулым годзе ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, у якіх абгрунтоўваецца неабходнасць змянення прававога рэгулявання, зыходзячы з канстытуцыйных палажэнняў аб праве грамадзян на працу, адукацыю, аб іх правах у сферы сямейных адносін і інш., знаходзяцца ў стадыі актыўнага выканання. Названае сведчыць аб значнасці работы, якая праводзіцца ў Канстытуцыйным Судзе са зваротамі грамадзян для забеспячэння канстытуцыйнай законнасці.

Многія пытанні, што ўзнімаюцца ў зваротах, датычацца практыкі прымянення нарматыўных прававых актаў. Гэта просьбы ўмяшацца ў дзейнасць (бяздзейнасць) дзяржаўных органаў, у тым ліку судовых, а таксама меркаванні і прапановы па належным вырашэнні канкрэтных жыццёвых сітуацый і да т.п. Такія пытанні, не падведамныя Канстытуцыйнаму Суду ў сілу яго функцый, вызначаных Канстытуцыяй, тым не менш з'яўляюцца важнай крыніцай дакладнай інфармацыі аб праблемах, што хвалююць

грамадства, і ў перспектыве могуць стаць прадметам разгляду Канстытуцыйным Судом у рамках яго кампетэнцыі.

Адна з форм доступу грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя – іх звароты ў Канстытуцыйны Суд з інфармацыяй аб наяўнасці прабелаў, калізій і прававой нявызначанасці ў нарматыўных прававых актах у адпаведнасці з артыкулам 158 Закона «Аб канстытуцыйным судаводстве». Такія звароты разглядаюцца ў Канстытуцыйным Судзе з выкананнем парадку канстытуцыйнага вядзення, вызначанага главой 24 названага Закона і Рэгламентам Канстытуцыйнага Суда. Яны паглыблена вывучаюцца з мэтай пацвярджэння або абвяржэння абгрунтаванасці сумненняў, што ўзніклі ў заяўніка, аб наяўнасці ў нарматыўных прававых актах прабелаў, калізій і прававой нявызначанасці, у тым ліку з пункту гледжання магчымасці парушэння такімі недахопамі заканадаўства канстытуцыйных правоў заяўніка і іншых асоб. На падставе інфармацыі, якая змяшчаецца ў зваротах, Канстытуцыйны Суд мае права распачаць вядзенне па справе аб устараненні прабелаў, выключэнні калізій і прававой нявызначанасці ў нарматыўных прававых актах.

З улікам канстытуцыйна-прававога значэння пастаўленых у такіх зваротах пытанняў у мінулым годзе Канстытуцыйным Судом вынесена, напрыклад, рашэнне ад 26 красавіка «Аб праве на абскарджанне рашэнняў падатковых органаў, дзеянняў (бяздзейнасці) іх службовых асоб». Яно прынята па выніках вывучэння пастаўленых у звароце грамадзяніна пытанняў аб прававым прабеле ў частцы адсутнасці ў асоб, якія не з’яўляюцца ў адпаведнасці з Падатковым кодэксам Рэспублікі Беларусь плацельшчыкамі падаткаў, збораў (пошлін) (іншымі абавязанымі асобамі), права на абскарджанне рашэнняў падатковых органаў, дзеянняў (бяздзейнасці) службовых асоб гэтых органаў, якімі закранаюцца правы такіх асоб. Канстытуцыйны Суд прызнаў неабходным устараніць выяўлены прабел канстытуцыйна-прававога рэгулявання шляхам унясення ў Падатковы кодэкс змяненняў і дапаўненняў, што прадугледжваюць права кожнай асобы на абскарджанне рашэнняў падатковых органаў, дзеянняў (бяздзейнасці) іх службовых асоб, калі, на думку гэтай асобы, такія рашэнні, дзеянні або бяздзейнасць парушаюць яе правы і законныя інтарэсы.

Выкананне рашэнняў Канстытуцыйнага Суда ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь. Так, з улікам згаданага рашэння ад 26 красавіка 2016 года артыкул 85 Падатковага кодэкса выкладзены ў новай рэдакцыі. Цяпер кожная асоба мае права абскардзіць рашэнні падатковых органаў, у тым ліку патрабаванні (прадпісанні) аб ліквідацыі парушэнняў, дзеянняў (бяздзейнасці) іх службовых асоб, калі такая асоба мяркуе, што гэтыя рашэнні або дзеянні (бяздзейнасць) парушаюць яго правы і (або) законныя інтарэсы.

Змешчаная ў зваротах шэрага грамадзян інфармацыя аб наяўнасці прававых прабелаў, калізій і прававой нявызначанасці ў рэгуляванні парадку пакрыцця шкоды, прычыненай фізічнай або юрыдычнай асобе незаконнымі дзеяннямі суда, органа, які вядзе адміністрацыйны працэс, дала магчымасць Канстытуцыйнаму Суду выявіць прававыя праблемы, што датычацца прыпынення дзейнасці юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. У выніку было прынята рашэнне ад 25 мая 2016 года «Аб прававым рэгуляванні прыпынення дзейнасці юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў».

Гэтыя рашэнні Канстытуцыйнага Суда змяшчаюць канкрэтныя прапановы суб’екту заканадаўчай ініцыятывы (у пераважнай большасці выпадкаў ім выступае Савет Міністраў) унесці ва ўстаноўленым парадку праект закона ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым Канстытуцыйным Судом акрэсліваюцца змяненні ў прававым рэгуляванні, якія павінны быць унесены ў мэтах устаранення канстытуцыйна значных недахопаў заканадаўства.

Прымаючы рашэнні, накіраваныя на ўстараненне ў прававых актах прабелаў, выключэнне ў іх калізій і прававой нявызначанасці ў мэтах зацвярджэння канстытуцыяналізму, Канстытуцыйны Суд дзейнічае ў межах свайго канстытуцыйнага статусу, не падмяняючы заканадаўцу або іншы нарматворчы орган. Пры гэтым ён у пэўнай ступені выконвае функцыі «пазітыўнага заканадаўца», вызначаючы напрамкі выпрацоўкі і прававога замацавання дзейсных механізмаў рэалізацыі канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян.

У названым вышэй Даследаванні Венецыянскай камісіі ўказваецца: адпаведныя функцыі канстытуцыйных судоў могуць стаць падставай для канфлікту з парламентам, бо канстытуцыйны суд устанаўлівае, што прабел павінен быць запоўнены, і вызначае якім чынам. Аднак практыка паказвае, што Канстытуцыйнаму Суду ўдаецца захаваць неабходны баланс уплыву на развіццё заканадаўства, таму ў Беларусі такія канфлікты адсутнічаюць.

Асаблівая форма доступу грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя абумоўлена артыкулам 112 Канстытуцыі, які прадугледжвае: калі пры разглядзе канкрэтнай справы суд прыйдзе да высновы аб неадпаведнасці нарматыўнага акта Канстытуцыі, то ён прымае рашэнне ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і ставіць ва ўстаноўленым парадку пытанне аб прызнанні дадзенага нарматыўнага акта неканстытуцыйным. У развіццё канстытуцыйных норм артыкулам 61 Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў вызначана, што Прэзідыум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь разглядае хадайніцтвы аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў і ў выпадку прызнання іх абгрунтаванымі ў дзесяцідзённы тэрмін звяртаецца ў Канстытуцыйны Суд з прапановай аб дачы заключэння аб канстытуцыйнасці адпаведнага акта. Аднак гэты механізм узаемадзеяння судоў агульнай юрысдыкцыі з Канстытуцыйным Судом, прызнаны ў еўрапейскай канстытуцыйна-прававой дактрыне адным з найбольш эфектыўных спосабаў абароны канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян, у айчыннай практыцы канстытуцыйнага кантролю пакуль не быў выкарыстаны.



Канстытуцыйны Суд у сваіх штогадовых пасланнях аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь звяртаў увагу, што на заканадаўчым узроўні мэтазгодна замацаваць механізм накіравання прэюдыцыяльнага запыту аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта, які падлягае прымяненню пры разглядзе канкрэтнай справы, на падставе ініцыятывы ўдзельнікаў судовага разбору; прадухіленне негатыўных наступстваў прымянення неканстытуцыйных нарматыўных актаў у судовай практыцы будзе спрыяць павышэнню даверу грамадзян да судовай сістэмы, узмацненню гарантый абароны правоў і свабод грамадзян, правоў і законных інтарэсаў арганізацый, умацаванню канстытуцыйнай законнасці (рашэнні ад 18 студзеня 2017 года і 20 студзеня 2016 года). У той жа час праблема заканадаўчага замацавання механізмаў рэалізацыі прэюдыцыяльнага запыту ў Канстытуцыйны Суд захоўвае сваю актуальнасць.

Значная колькасць зваротаў грамадзян, што паступаюць у Канстытуцыйны Суд і датычацца пытанняў рэалізацыі прынятых ім рашэнняў, сведчыць: гэтыя рашэнні з'яўляюцца актуальнымі, успрымаюцца ў грамадстве як абавязковыя для выканання, служаць інструментам для вырашэння канкрэтных прававых пытанняў. У цэлым можна адзначыць устойлівую пазітыўную дынаміку выканання рашэнняў Канстытуцыйнага Суда, імкненне ўцягнутых у працэс такога выканання органаў і службовых асоб паскорыць і аптымізаваць адпаведныя працэдуры. Разам з тым грамадзянамі звяртаецца ўвага на зацягванне выканання асобных рашэнняў Канстытуцыйнага Суда.

Звароты змяшчаюць таксама інфармацыю аб тым, што праватворчымі і правапрымяняльнымі органамі не заўсёды паслядоўна рэалізуюцца пра-

вавыя пазіцыі Канстытуцыйнага Суда, выкладзеныя ў яго рашэннях. Неабходна адзначыць, што прававыя пазіцыі фармулююцца Канстытуцыйным Судом зыходзячы з канстытуцыйных палажэнняў у мэтах выяўлення канстытуцыйна-прававога сэнсу нормаў законаў. Яны накіраваны на забеспячэнне канстытуцыйнасці праватворчасці і правапрымянення, садзейнічаюць прававой бяспецы і прадказальнасці прававога рэгулявання, павышаюць гарантыі дзяржаўнай абароны канстытуцыйных правоў і свабод, служаць інструментам забеспячэння ўзаемадзеяння грамадзян і дзяржаўнай улады на канстытуцыйнай аснове. У сувязі з гэтым удасканаленне заканадаўчага рэгулявання канстытуцыйна-судовага тлумачэння, а менавіта канстытуцыйна-прававой інтэрпрэтацыі Канстытуцыйным Судом палажэнняў нарматыўных прававых актаў, мае перспектыўны характар.

Такім чынам, у зваротах грамадзян у Канстытуцыйны Суд указваецца на актуальныя сацыяльныя праблемы, якія патрабуюць вырашэння на канстытуцыйна-прававой аснове, выказваюцца меркаванні адпаведных слаёў грамадства наконт эфектыўнасці заканадаўства, ступені неабходнасці яго ўдасканалення ў мэтах забеспячэння канстытуцыйнай законнасці. Гэтыя звароты з'яўляюцца крыніцай інфармацыі аб прабелах, калізіях, прававой нявызначанасці, іншых канстытуцыйна значных недахопах заканадаўства, якія павінны быць пераадолены з выкарыстаннем прадастаўленых Канстытуцыйнаму Суду паўнамоцтваў, садзейнічаюць фарміраванню перадумоў для ўдасканалення дзейнасці Канстытуцыйнага Суда і яе прававога рэгулявання.

Забеспячэнне сістэмнай цэласнасці канстытуцыйнага кантролю, выкарыстання яго патэнцыялу як дзейснага інструменту вырашэння прававых канфліктаў падразумявае паўнацэнную рэалізацыю паўнамоцтваў іншых дзяржаўных органаў, звязаных з забеспячэннем доступу грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя. Паслядоўнае зацвярджэнне канстытуцыяналізму патрабуе пастаяннага павышэння ўзроўню канстытуцыйнага мыслення ўсіх суб'ектаў грамадскіх адносін, забеспячэння рэальнага дзеяння прынцыпу вяршэнства права ў якасці галоўнага крытэрыю сацыяльных паводзін кожнага, што прадугледжвае актыўную рэалізацыю ім сваіх правоў і добрасумленнае выкананне канстытуцыйна вызначаных абавязкаў.

ПОДПИСКА НА ЖУРНАЛ

Идет подписка на «Беларускую думку» на I полугодие 2017 года!

**«БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА»**

**74938** – ИНДИВИДУАЛЬНАЯ ПОДПИСКА.

**Стоимость:** 1 мес. – 2,76 руб., 3 мес. – 8,28 руб., 6 мес. – 16,56 руб.

**749382** – ВЕДОМСТВЕННАЯ ПОДПИСКА.

**Стоимость:** 1 мес. – 7,60 руб., 3 мес. – 22,80 руб., 6 мес. – 45,60 руб. (включая НДС).

**СТОИМОСТЬ ЖУРНАЛА ПО ПОДПИСКЕ НИЖЕ РОЗНИЧНОЙ**